**Беларуская мова. 3 кл**
**ТЭМА: Антонімы, іх роля ў маўленні**
**Настаўнік: Магілевіч З.В,**

**Мэты ўрока:** садзейнічаць паглыбленню ведаў пра ролю антонімаў у беларускай мове; удасканальваць ўменне знаходзіць антонімы ў тэксце, вызначаць іх сэнсава-стылістычную ролю; фарміраваць ўменне падбіраць антонімы да слоў розных семантычных груп; стварыць умовы для папаўнення лексічнага запасу вучняў; фарміраваць навыкі правільнага пісьма; выхоўваць любоў да Беларусі, павагу да матуль.

**Абсталяванне: інтэрактыўная дошка**
"Слоўнік антонімаў" У.М.Лазоўскі

**Ход урока**

**1.** Арганізацыйны момант
**2.** Праверка Д\З
**3.** Паведамленне тэмы, пастаноўка задач
**4.** Паглыбленне ведаў па тэме
**5.** Падвядзенне вынікаў
**6.** Выстаўленне адзнак. Д/з
**7.** Рэфлексія

1. ***Слова настаўніка***

Прывітанне, сябры.
Адкрыйце сшыткі і запішыце дату.

***2. Праверка Д/З:***
Мы рыхтуемся да праверкі Д/з. Вам патрэбна будзе выканаць невялікі тэст.

1. Выберыце правільнае азначэнне.

*а) Лексіка -* гэта навука аб гуках мовы.
*б) Лексіка -* гэта навука, якая вывучае часціны мовы.
*в) Лексіка -* гэта навука, якая вывучае слоўнікавы склад мовы

2.Працягніце фразу:

*Лексічнае значэнне слова- гэта...*

3.У беларускай мове словы маюць:

*а) прамое і непрамое значэнне*
*б) прамое і пераноснае значэнне*
*в) ускоснае і пераноснае значэнне*

4. У якіх фразах дзеяслоў "гарэць" ужыты ў пераносным значэнні?

а) вушы гараць; в) Міхась гарыць на працы;
б) касцёр гарыць; г) дровы гараць;

5.Словы адной часціны мовы, блізкія па значэнні:

а) -амонімы
б) -сінонімы
в) -мнагазначныя

6.Падабраць сінонімы да слова Радзіма

1. в;
2. Лексічнаезначэнне-гэта тое, што слова абазначае;
3. б;
4. а,в.
5 б
6.Айчына, Бацькаўшчына

? Як мы павінны адносіцца да Беларусі?

***Узаемаправерка.*** **Праверце сябе**
**Я бачу , што вы засвоілі тэму.**

**Падрыхтоўка да засваення новай тэмы. Мэтавызначэнне**

— Зараз мы пагуляем. Я называю словы, а вы — словы з супрацьлеглым значэннем.

*Абуцца-разуцца, вечар-раніца, забараніць-дазволіць, поўны-пусты,дужы-слабы, мір-вайна.*

?Якія асацыяцыі выклікаюць у вас два апошнія словы?

Што такое вайна?

Як мы павінны адносіцца да ветэранаў?

— Як называюцца такія пары слоў? (Антонімы.)

— Якой часцінай мовы могуць быць антонімы? (Належаць да адной часціны мовы.)

Многае пра антонімы вы ведаеце з пачатковай школы. Якія мэты нашага ўрока? Якія задачы, на вашу думку, мы павінны вырашыць? (Паглыбіць веды па тэме, замацаваць уменне знаходзіць антонімы, падбіраць антонімы да слоў.)

Так што такое антонімы?

**Работа з правілам**

Давайце звернемся да **правіла**,можа мы што не сказалі? (ст.87)

**Прымяненне ведаў на практыцы**

**А зараз прыменім атрыманыя веды на практыцы:**

**Да словазлучэнняў падбярыце антанімічныя.**

Узор: цёмная ноч — ясны дзень.

Халодная зіма-цёплае лета, любоў да сяброў-нянавісць да ворагаў, позна лёг-рана ўстаў, паехаць раніцай-пайсці вечарам, ручны гадзіннік-насценны гадзіннік, цвёрды гук-мяккі гук,

— Ці да ўсіх слоў можна падабраць антонімы?

— Які можна зрабіць вывад?

**Вывад:** большасць слоў не мае антонімаў, напрыклад, *гук, гадзіннік.*

**Запісаць пад дыктоўку:**

*Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына; паміж сваіх і чужакоў яна мне ласкай матчынай.*

? Падкрэсліць антонімы. Пра якога роднага чалавека ўпамінаецца ў вершы?

**Фізкультхвілінка: паглядзіце на лічбу 8 . Правядзіце вочкамі па ёй ў розныя бакі. Заплюшчыце вочкі і падумайце, якія асацыяцыі выклікае гэтая лічба? Вершы пра маму.**

***Знаёмства са слоўнікам антонімаў. Аўтар- Уладзімір Міхайлавіч Лазоўскі***

**Прачытаць прыказкі. Падабраць словы-антонімы да выдзеленых слоў і запісаць.**

1. **Чорнае**______не стане.
2. Дрэнны **пачатак** не к добраму______.
3. **Лёгка** раскідаць, ды________збіраць.
4. Хто **чужога** не шануе, той _______не мае.
5. **Добрае** чуваць далека,_______яшчэ далей.

**Да слоў з левага слупка падбярыце словы з супрацьлеглым значэннем з правага слупка.**

| | |
|---|---|
| Доўгі | поўнач |
| надзея | салодкі |
| Поўдзень | адчай |
| Кіслы | баязлівасць |
| Адвага | кароткі |

## Лексічная работа

**<u>Спісаць,замяняючы выдзеленыя словы антонімамі (на дошцы).</u> Дзе трэба, змяняйце формы слоў**

**<u>Восень</u>** лічыцца **<u>сумнай</u>** парой**.** **<u>Гаснуць</u>** у гэты час яркія фарбы на лугах і палях. **<u>Змаўкае</u>** лес. Птушкі **<u>адлятаюць</u>** у вырай. **<u>Хмурнее</u>** неба. Уся прырода **<u>замірае.</u>** **<u>Цішай,</u>** напоўнена зямля. Сонца быццам **<u>слабее</u>**, робіцца **<u>нядужым</u>**. Ёсць асаблівае хараство ў **<u>асенніх</u>** фарбах.

*<u>Вясна</u> лічыцца <u>радаснай</u> парой. <u>Загараюцца</u> ў гэты час яркія фарбы на палях.<u>Гамоніць</u> лес.Птушкі <u>прылятаюць</u> з выраю.<u>Яснее</u> неба.Уся прырода <u>ажывае</u>. <u>Гулам</u> напоўнена зямля. Сонца быццам <u>мацнее</u>, робіцца <u>дужым</u>. Ёсць асаблівае хараство ў <u>вясенніх</u> фарбах.*

**<u>Гульня "трэцяе лішняе"</u>**
*Горача,**светла**, холадна*
*Добры, блізкі , **далёкі***
*Адважны, баязлівы, **страшны***
***Лёгкі,** мяккі, цвёрды*

**<u>Падбярыце да прыведзеных слоў спачатку сінонімы, а потым — антонімы, вызначыць,якой часцінай мовы яны з'яўляюцца.</u>**

**Прыяцель**,сябар, дружбак-вораг,непрыяцель
**Радасны**, вясёлы-сумны, тужлівы
**Загарэцца,** успыхнуць-патухнуць

**Падбярыце антонімы і запішыце іх па сэнсу да прыметнікаў на месцы прапушчаных слоў:**

Ёсць людзі добрыя і …,мужныя і …, вясёлыя і ….,здаровыя і …, старыя і …., аптымістычныя і …, моцныя і ….,актыўныя і ……

Ёсць людзі добрыя і злыя, мужныя і труслівыя, вясёлыя і мумныя,здаровыя і хворыя, старыя і маладыя, , аптымістычныя іпесімістычныя, моцныя і слабыя.

**<u>Тлумачэнне месца ўрока ў тэме:</u>** на наступных уроках мы працягнем удасканальваць веды па дадзенай тэме.

**Д/з**
**Запісаць загалоўкі мастацкіх твораў, у якіх ёсць антонімы:**
**"Блізкім і далёкім" (Я.Купала)**

## Выстаўленне адзнак

**Рэфлексія:**
**А зараз паглядзіце на трохкутнік:**
-Хто з вас аказаўся на вяршыні ведаў па тэме?(вучні падымаюць рукі, настаўнік запісвае колькасць у піраміду)
-У каго засталіся пытанні па тэме? ?(вучні падымаюць рукі, настаўнік запісвае колькасць у піраміду)
-Каму яшчэ трэба папрацаваць ?(вучні падымаюць рукі, настаўнік запісвае колькасць у піраміду)

Што было цікавым?
Што такое антонімы?
Песня "Спадчына"

